паходжаньня двух словаў. Калі *Волат* у шмат якіх дасьледнікаў лічыцца пазычаньнем, то Асілак — адвеку наш.

Прысутнасьць *Волатаў* у вуснай народнай творчасьці можа паказваць на тое, што яны ў свой час адыгралі заўважную ролю ў гісторыі беларускай зямлі. Больш за тое, яны пакінулі па сабе матэрыяльныя памяткі свайго існаваньня — курганы-*валатоўкі*, якія часам утвараюць цэлыя могільнікі — ад двух да 20–30 і больш капцоў. *Волаты*, *Волатава*, *Валатоўшчына*, *Валатоўкі*, *Волатава магіла* — назвы паселішч. Міхал *Валатоўскі* — беларускі этнограф і краязнаўца другой паловы XIX стагодзьдзя, які вывучаў Палесьсе.

У сёньняшнім беларускім жыцьці словы „*волат*" і „асілак" — сынонімы, да якіх можна дадаць: сілач, магут, здаравяк, здаравіла, здаравец, атлет і вядома ж, стылёва зьніжанае, пераноснае — бугай.

Усе яны прайграюць *Волату* і Асілку ў адным: яны характарызуюць чалавека толькі зь фізычнага боку. *Волат*, Асілак і магут — цэлая жыцьцёвая філязофія. Ніхто зь іх не асацыюецца з грузчыкам. Нікога нельга ўявіць удзельнікам п'янай бойкі. Яны чыстыя, незаплямленыя. Яны — героі. Яны — жыцьцёва значныя адзінкі, якіх так не стае сучаснай Беларусі.

# Вуліца

***Анатоль Вярцінскі***

Вясковая і гарадзкая, вузкая і шырокая, простая і крывая, адкрытая, што выводзіць на выган, на дарогу, на тракт, і глухая, тупіковая, што вядзе ў нікуды. *Вуліца* пясчаная, пыльная або гразкая, брукаваная або пакрытая асфальтам — на чорным асфальце асабліва відаць крывавыя плямы.

Ад *вуліцы* згадваю неаддзельнае вясковае дзяцінства:

— Куды, сынок?

— На *вуліцу*...

Сёньня ў гарадах моладзь на тое ж пытаньне адказвае — *на вуліцу*, на плошчу, на дэманстрацыю.

Улады прысвоілі сабе права вырашаць, па якой *вуліцы* дэманстрантам можна ісьці, а па якой нельга. І калі яны, дэманстранты, барані Бог, раптам пойдуць не па той, не па дазволенай *вуліцы*, ахоўнікі парадку іх могуць сустрэць дубінкамі і сьлезацечным газам.

Ёсьць такі выраз — *сьвята на нашай вуліцы*. Менавіта яго ўжыла тры гады таму група вядомых літаратараў і навукоўцаў, калі выступіла супраць скасаваньня нашага галоўнага нацыянальнага сьвята, зьвязанага з абвяшчэньнем Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларусі.

Дык што сьвяткаваць нам, беларусам? Ці будзе на нашай *вуліцы* сьвята? — пыталіся аўтары артыкулу. Сапраўды, ці будзе, а як будзе — то калі і якое сьвята на нашай беларускай *вуліцы*?

# Вусны

***Сяргей Харэўскі***

„Адказваць пісьмова ці *вусна*?" — пытаюцца вучні ў настаўнікаў. Калі *вусна* — той адказ будзе распаведзены *вуснамі*.